Помимо стендов, экспозиция комплекса также представлена музейными предметами, иллюстрирующими историю района. Среди них: удостоверения первых секретарей райкома, фотографии разных лет, награды и подарки района. В материалах, объединенных темой «Славные вехи Омского нефтеперерабатывающего завода», можно встретить портрет первого директора завода А.М. Малунцева, его трудовую биографию. В хронологическом порядке размещены фото разных лет, на которых запечатлены: первостроители завода, торжественное открытие завода, 10-летний юбилей предприятия, пуск новых установок, Первомайские демонстрации и просто коллективные фото работников.

Таким образом, в экспозиции музейного комплекса Администрации Советского округа города Омска нашли свое отражение все основные вехи истории района. Закономерно, главной целью было показать развитие того пространства, которое в настоящее время охватывает территориально Советский округ. Акцент был сделан на развитие промышленного и жилого сектора, а также на административные изменения.

В целом, краткое описание основных периодов истории района позволяет сделать ряд важных выводов о его составных частях. Во-первых, делая акцент на определенных переменах в жизни района, становится возможным периодизация его истории и выделение наиболее знаковых событий. Во-вторых, исходя из экспозиции, складывается впечатление о том, что городок нефтяников, хотя и стал основой для района, все-таки его историческое ядро охватывает территорию, находящуюся ближе к городу Омску, и включает улицу Красный Путь, городок водников и прилегающие территории. Хотя реально, эта часть района развивалась гораздо более медленно, чем молодой микрорайон городок нефтяников. В-третьих, начиная с определенного этапа, городок нефтяников становится лучшим районом по благоустройству и озеленению. На сегодняшний день это остается одним из преимуществ района, которое, исходя из вызовов современности, авторы экспозиции, подчеркивают в фотоматериале и в информационном содержании стендов.

Анализ экспозиции позволяет произвести реконструкцию истории района в целом. Однако в ней важно учесть субъективный фактор и современные тенденции, которые закономерно накладывались на историческое повествование. Для формирования более полной картины истории района, необходимо привлечение широкого круга источников, а также беседа с авторами экспозиции для выявления основных идей и предпосылок, которыми они руководствовались при ее создании.

**Ермалёнак В.А.**

## ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ЗДЫМКАЎ ПОЛЬСКАГА АФІЦЭРА З ФОНДАЎ ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ ШКОЛЫ № 3 г. МІЁРЫ

У фондах музеяў Міёрскай сярэдняй школы знаходзіцца больш тысячы ўнікальных фотаздымкаў, якія з'яўляюцца важнай крыніцай вывучэння асобных старонак гісторыі края. Шмат здымкаў патрабуюць ідэнтыфікацыі. Вось адзін з прыкладаў даследавання старых фотаздымкаў. Гісторыя іх пачалася яшчэ ў 2007 годзе, калі ў Міёрах разбіралі стары будынак гатэлю. За падшыўкай шпалеры другога паверха рабочы камунгаса Віктар Лагун знайшоў пачак старых здымкаў, якія і перадаў спачатку ў рэдакцыю раённай газеты, а потым яны трапілі ў гістарычны музей Міёрскай СШ №3. Усяго было знойдзена 196 фотаздымкаў. Захаванасць большасці з іх была здавальняючай. Некаторыя з іх былі зроблены ў прафесійных фотамайстэрнях, але большая частка – аматарскія, невялікіх памераў, што сведчыла аб тым , што іх уладальнік карыстаўся сваім фотаапаратам. Першапачатковае вывучэнне подпісаў высветліла, што здымкі належылі польскаму паручніку жандармерыі КОП (корпус аховы пагранічча). Большасць здымкаў было зроблена ў 1936-1939 гадах. З надпісаў мы даведаліся, што іх уладальнік скончыў у 1936 годзе курсы ў Невяркуве (Валынь Заходняя Украіна).



Репозиторий ВГУ

Многія здымкі былі пазначаны гарадамі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны: Клецк, Слуцк, Валожын, Гродна, Стоўбцы і іншыя. На іх мы бачым вайскоўцаў на вучэннях, у адпачынку,на курорце Друскінінкай, пад час службы. Гэта своеасаблівы летапіс вайскоўца. Шмат здымкаў жанчын з розных месцаў Польшчы і Беларусі. На большасці жаночых здымкаў подпісы "найкаханейшаму", "адзінаму ў свеце", што, на наш погляд, сведчыла аб тым, што малады абаяльны афіцэр карыстаўся поспехам у жанчын. Пры першапачатковым даследаванні мала знайшлося сямейных здымкаў. Ёсць толькі некалькі партрэтаў яго стрыечных сясцёр, якія жылі ў Радаме, Жэшуве, Кабярцове, Кадлубове, Бакацыне. Але на ніводным фотаздымку няма прозвішчаў, толькі імёны. Наша першапачатковае меркаванне было наступным. Паручнік Эдвард у 1936-1938 годзе служыў у батальёне КОП "Клецк", таму што больш за ўсё на вайсковых здымках подпісы гэтага горада. Але адзін з самых апошніх па часу здымкаў быў пазначаны подпісам "Янэк м. Лужкі жнівень 1939 г. "Гэтым жа годам пазначаны і фотаздымак жанчыны ля вагона з надпісам "Вільня – Друя " З успамінаў старажыхароў мы ведалі, пасля нападу СССР на Польшчу 17 верасня 1939 года, польскія пагранічнікі ў нашых мясцінах адступалі ў бок латышскай мяжы. Так наш паручнік Эдвард мог спыніцца ў гатэлі ў Міёрах, дзе і схаваў свае здымкі за шпалерай да лепшых часоў. Ён разумеў магчымасць палону і не хацеў, каб здымкі яго сяброў-афіцэраў трапілі ў чужыя рукі. З альбома яны былі вырваны, калі паручнік паспешліва пакідаў казармы, таму некаторыя фотаздымкі былі нават з вугалкамі, больш вялікія па памерах былі складзены папалам , так як не змяшчаліся ў кішэні. Раз гаспадар не вярнуўся за імі , значыць лёс яго склаўся трагічна. У 1940 годзе з далучэннем Латвіі да СССР былыя польскія ваенныя трапілі ў савецкі палон. Паручнік Эдвард хутчэй за ўсё мог быць расстраляны, як і большасць малодшых афіцэраў у Катыні, або, трапіўшы ў армію Андэрса, зноў жа мог загінуць у Афрыцы або Італіі. Пазбегшы палону, трапіўшы ў Армію Краёву - польскія партызанскія фарміраванні часоў другой сусветнай вайны-, і там таксама лёс яго мог быць трагічны. Такія былі нашы першыя гіпотэзы пасля папярэдняга вывучэння старых фотаздымкаў. Нашы першапачатковыя меркаванні былі надрукаваны ў артыкулах, змешчаных у раённай газеце "Міёрскія навіны", " Краязнаўчай газеце " [5, с. 3].

Далей перад намі стаяла складаная задача: дакладна даведацца прозвішча ўладальніка здымкаў і яго лёс. Пачаўся дасціпны пошук, які доўжыўся амаль чатыры гады. Праводзіць яго было складана, бо, знаходзячыся ў Беларусі, цяжка было непасрэдна трапіць у польскія вайсковыя архівы або знайсці неабходныя дакументы і кнігі. Спачатку мы пісьмова звярнуліся ў галоўны вайсковы архіў у Рэмбертове ля Варшавы, архіў стражы пагранічнай у Гданьску, але ніякіх адказаў не атрымалі.

Пазней мы ўсталявалі сувязь з таварыствам "Карта", якое займаецца зборам і ўшанаваннем памяці рэпрэсаваных палякаў, інстытутам памяці народнай у Варшаве, расійскім таварыствам "Мемарыял" і інш. Важную ролю ў пошуку адыграла таварыства браслаўчан у Варшаве на чале з іх старшынёй Уладзіславам Краўчуком і яго намеснікам Зофіяй Пранеўскай-Важыньскай. Было наладжана ліставанне з краязнаўцам з Клецка Андрэем Бліноцом, які якраз у гэты час займаўся вывучэннем гісторыі КОПу " Клецк." Былі выкарыстаны інтэрнэт-рэсурсы, атрыманы выпіскі з кніг : І. Тухольскага "Забойства ў Катыні", "Медная, Кніга польскіх ваенных пахаванняў. Том II", "Пазначаны пячаткай Асташкова" і г. д.

Праводзіць пошук было вельмі цяжка, таму што вайскоўцаў-пагранічнікаў, у якіх было імя Эдвард было шмат, як у Клецку, так і ў іншых батальёнах КОПу, не захаваліся і спісы малодшых афіцэраў за многія гады, але ўсё ж наш працяглы пошук завяршыўся паспяхова. Дзякуючы пазначаным крыніцам, удалося высветліць як прозвішча ўладальніка фотаздымкаў, так і яго лёс. На жаль, наша меркаванне спраўдзілася: жыццё паручніка-пагранічніка завяршылася трагічна. Вось што нам на сённяшні дзень стала вядома.



Репозиторий ВГУ

Нарадзіўся Эдвард Пянькоўскі 23 верасня 1902 года ў Лодзі. Бацька яго быў Антон, маці Гэлена з Кавальскіх. І сапраўды, пры больш уважлівым вывучэнні некаторых здымкаў, на якіх адбываецца пахаванне, на вялікай стужцы мы бачым надпіс на польскай мове "Памяці Антона". Значыць, гэта было пахаванне бацькі Эдварда, на якім ён прысутнічаў і трымаў гэтую стужку. Таксама на адным са здымкаў мы бачым Эдварда ў цывільнай форме з чорнай павязкай на рукаве і яго хутчэй за ўсё сясцёр і маці таксама ў жалобным адзенні. Адзін з такіх здымкаў на фоне, хутчэй за ўсё, іх сядзібы.

У кароткіх біяграфічных звестках сказана, што Эдвард прымаў удзел у першым сілезскім паўстанні, якое адбылося з мэтай аднаўлення незалежнасці Польшчы . У 17 год добраахвотнікам уступіў у польскае войска , ваяваў у складзе 40-га Львоўскага пяхотнага палка з 1 жніўня 1919 года па 2 снежня 1921 года. Мужнасць у баях была адзначана памятным медалём за вайну 1918-1921 года і медалём дзесяцігоддзя заваёвы незалежнасці Рэчы Паспалітай [2, с. 685]. Сапраўды, на вайсковых здымках Эдварда мы бачым на мундзіры дзве ўзагароды. З 8 жніўня 1930 года яго вайсковая служба праходзіла ў 19 батальёне КОП у Слабодцы( зараз Браслаўскі раён Віцебскай вобласці). У гэты час ён быў жанаты, яго сын Андрэй нарадзіўся ў Браславе ў 1930 годзе. На адным з непадпісаных здымкаў мы і бачым хутчэй за ўсё яго жонку з маленькім сынам, але, напэўна, пазней ён разышоўся з ёй, таму што на некаторых фотаздымках мы бачым заручальны пярсцёнак у яго на левай руцэ. І ў дакументах рэпрэсаваных сямей вайскоўцаў, якіх вывозілі ў 1940 годзе ў Сібір, Казахстан мы не знаходзім сям'і Пянькоўскіх.

Уважлівы прагляд выцвелых і пажоўклых здымкаў пацвердзіў знаходжанне паручніка Эдварда ў Слабодцы, на адным з іх ёсць постаць яго і невядомай жанчыны на фоне возера і Слабодскага касцёла. На жаль, не ўсе вайсковыя дакументы захаваліся, не ўсе нам удалося адшукаць. Са знойдзенага мы ведаем, што батальён КОП "Слабодка" быў расфарміраваны ў красавіку 1939 года і накіраваны да горада Аўгустова. [1, с. 254] 13 верасня 1939 года трэці батальён корпуса аховы пагранічча "Слабодка" праводзіў баі з фашыстамі на Сувальшчыне. А пазней разам з трэцім пяхотным палком КОП накіраваны на Валынь у раён Роўна, дзе 23 верасня ў раёне вёскі Радошын ён капітуляваў, але лёс нашага героя быў іншым. Хутчэй за ўсё ён яшчэ заставаўся для правядзення мабілізацыі ў батальёны КОПа "Лужкі " і "Падсвілле". У вайсковых дакументах адзначана, што 1 верасня 1939 года харунжы Эдвард Пенькоўскі быў накіраваны ў распараджэнне батальёна КОП "Клецк" [3, с. 128]. Вось менавіта ў гэты час харунжы Эдвард Пянькоўскі мог спыніцца ў гатэлі мястэчка Мёры і аставіць свае фотаздымкі. 17 верасня 1939 года пасля нападу СССР на Польшчу батальён"Клецк", дзе ўжо знаходзіўся наш герой, быў падпарадкаваны брыгадзе КОП "Палессе". Каб злучыцца з брыгадай, батальён пачаў паступова адступаць на поўдзень спачатку, на Крывошын, потым Лунінец, Камень Кашырскі, Ратна, Шацк. За 15 дзён адступлення польскія пагранічнікі прайшлі 447 кіламетры. Апошні бой батальёна "Клецк" адбыўся 30 верасня ля ўкраінскага мястэчка Вытачна, а 1 кастрычніка камандуючы брыгадай "Палессе " генерал Орлік-Рюкеман аддаў загад спыніць баявыя дзеянні. Большая частка вайскоўцаў трапіла ў палон, некаторая частка здолела выратавацца і перайсці да партызанскіх форм барацьбы. Менавіта Эдвард Пянькоўскі ў гэтых мясцінах трапіў у савецкі палон. У складзе ваеннапалонных ён знаходзіўся ў лагеры Асташкоў непадалёку ад Калініна (цяпер Цвер, 200 км ад Масквы). 4 красавіка па распараджэнні кіраўніцтва СССР Сталіна і наркома НКУС Берыі пачаліся расстрэлы польскіх афіцэраў. У лагеры Асташкоў было расстраляна за месяц 6300 ваеннапалонных. У іх ліку быў і харунжы Эдвард Пянькоўскі. Толькі ў 1990 годзе было знойдзена месца, дзе былі пахаваны расстраляныя польскія афіцэры [4, с. 46]. Гэта гісторыя, спадзяюся, яшчэ будзе мець працяг. Працягваецца пошук сына Эдварда Андрэя, або яго іншых сваякоў. Пад пытаннем застаецца яшчэ і ўмовы, калі і пры якіх былі схаваны фотаздымкі ў гатэлі. Спадзяёмся і гэтыя згадкі будуць высветлены.

Репозиторий ВГУ

1. Dr Jerzy Prochwicz, Andrzej Konstankiewicz, Jan Rutkiewicz, "Korpus Ochrony Pogranicza 1924-1939", wyd. Barwa i Bron, Warszawa 2003, ISBN 83-900217-9-4.
2. Miednoje. Ksiкga Cmentarna Polskiego Cmentarza Wojennego, tom. II, Warszawa 2005.
3. J. Tucholski: Mord w Katyniu, Warszawa 1991.
4. Krzysztof Persak – Ekshumacje katycskie. Prace archeologiczno-ekshumacyjne w Charkowie, Katyniu i Miednoje w latach 1991–1996 i ich wyniki // Biuletyn Instytutu Pamiкci Narodowej, Warszawa, nr 4, 2010, ISSN 1641-9561.
5. Ермалёнак В.А. Якi твой лёс паручнiк Эдвард // Краязнаўчая газета, №2, 2008.
6. http://www.indeks.karta.org.pl/

**Свилас С.Ф.**

## ОБ УЧАСТИИ АРХИВИСТОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР В МЕЖДУНАРОДНОМ СОТРУДНИЧЕСТВЕ В ГОДЫ ХРУЩЕВСКОЙ «ОТТЕПЕЛИ»

О вкладе советских специалистов в международное архивное сотрудничество писали российские эксперты Г.А. Белов, Г.А. Дремина, М.Я. Капран, Е.В. Старостин. Вопрос, рассматриваемый автором, не нашел достаточного отражения в белорусской историографии. Участие Белорусской ССР в деятельности Международного совета архивов в 1956 – 1964 гг. показано на основе документов внешнеполитического ведомства республики, рассекреченных в 1990-е годы и впервые вводимых в научный оборот.

Архивисты всего мира сталкиваются с одинаковыми проблемами отбора документов, обеспечения их хранения и организации поиска исследователями. Интерес народов друг к другу в значительной степени удовлетворяется архивами. Политики, анализируя эффективность сотрудничества своего государства с другими или членства в международных организациях, обращаются к изучению генезиса взаимоотношений на основе источников. Эти три главных мотива являются основой международного архивного сотрудничества [2, с. 82], активизация участия в котором советских специалистов произошла в годы хрущевской «оттепели».

В январе 1956 г. Президиум ЦК КПСС и Совет Министров СССР приняли постановление о вступлении в Международный совет архивов (неправительственную общественную организацию, существовавшую с 1948 г. при активном взаимодействии с ЮНЕСКО) Главного архивного Управления СССР, Архивного управления УССР, Архивного управления Белорусской ССР и об участии представителей этих архивных органов в работе III Международного конгресса архивов (I конгресс состоялся в 1950 г. в Париже и II-й - в 1953 г. в Гааге, но на них советские представители не посылались). В соответствии с указанным постановлением Архивное управление БССР 2 февраля 1956 г. направило письмо председателю Международного совета архивов о своем вступлении в Международный совет архивов. 25 сентября 1956 г. Международный совет архивов принял Архивное управление БССР в число своих членов. Представителем архивистов республики в организации был назначен начальник Архивного управления при Совете Министров Белорусской ССР А.И.Азаров [1, д. 327, л. 212; д. 349, л. 174] - «1907 года рождения, русский, член КПСС с 1939, окончил Московский историко-архивный институт в 1940 году, кандидат исторических наук» [1, д. 334, л. 5].

На III Международном конгрессе архивов (Флоренция, октябрь 1956 г.) Белорусскую ССР в составе делегации Советского Союза представляли А.И. Азаров и В.А. Ильичева, «начальник Центрального государственного архива Октябрьской революции и социалистического строительства БССР, 1926 года рождения, член КПСС с 1953 года, русская, окончила Московский историко-архивный в 1948 году» [1, д. 334, л. 6]. Всего в работе конгресса приняли участие 560 архивистов из 45 стран, которые обсудили вопросы строительства архивных зданий, экспертизы ценности документов, а также вопрос о частных архивах. После окончания работы конгресса советская делегации посетила Рим и ряд других городов Италии, где ознакомились с постановкой архивного дела, а затем совершила поездку по архивам ГДР [1, д. 327, л. 216; д. 349, л. 175]. В рассекреченных документах белорусского внешнеполитического ведомства сохранились краткие воспоминания А.И. Азарова о поездке в Италию, носящие отнюдь не формаль-

Репозиторий ВГУ